*Працягваем дыскусію аб вячэрнім навучанні*

# Мае прапановы

Мне хочацца выказаць некаторыя думкі аб вячэрнім навучанні.

Па-першае, аб пачатку заняткаў. Як бачна, большасць вячэрнікаў заканчвае работу ў 17 гадзін. Адной гадзіны (з 17 да 18), напрыклад, мне недастаткова для таго, каб, працуючы на вуліцы Астроўскай, прыехаць дамоў на Грушаўскі пасёлак, пераапрануцца, павячэраць і паспець на заняткі ва універсітэт. І гэта так, бачна, у большасці вячэрнікаў. Побач жа з універсітэтам жыве і працуе мала хто. Трэба перапынак паміж заканчэннем працоўнага цыкла і пачаткам навучальнага павялічыць.

Пасля ж работы патрэбны і адпачынак арганізму. Прыход на вучобу адразу пасля работы не садзейнічае паспяховаму авалодванню ведамі.

Ёсць яшчэ цяжкасці. Вячэра ў сталовай, абед у сталовай — і атрымоўваецца, што вячэрнік здымаецца на шэсць гадоў з дамашняга сілкавання. А гэта, я ўпэўнены, пакуль што многіх не задавальняе. А потым — сям'я: чалавек ідзе з дому а 8 гадзіне раніцы, а вяртаецца ў 10 гадзін вечара. Такія ж цяжкасці і ў выкладчыкаў, якія чытаюць лекцыі як на дзённым, так і на вячэрнім аддзяленнях. На маю думку, заняткі на вячэрнім аддзяленні неабходна пачынаць з 19 гадзін.

Другое пытанне, якое я хацеў бы ўзняць, — гэта патрабаванне абавязковага канспектавання. Некаторыя выкладчыкі аж да непрыняцца залікаў патрабуюць абавязковага падрабязнага канспектавання лекцый і семінараў. Але ў вячэрнікаў часу для канспектавання дома проста няма. Праграма вячэрняга навучання вельмі ўшчыльнена. У такіх умовах абавязковае канспектаванне ставіць вячэрніка ў крытычнае становішча. Адзін з выкладчыкаў патрабуе ў нас падрабязнага канспектавання семінараў з пісьмовымі адказамі на ўсе пытанні. Але ж вывучыць — гэта адзін час, а заканспектаваць — у шмат разоў больш. А дзе возьме час вячэрнік? Напэўна ж, можна, не зніжаючы патрабаванняў на заліках і экзаменах, не патрабаваць абавязковага канспектавання. Кожны ж студэнт вядзе заўсёды канспект так, як гэта яму лепш дапамагае засвоіць матэрыял.

Адмоўна адбіваецца на нашай падрыхтоўцы тое, што ў вячэрнікаў няма вытворчай практыкі.

Я хацеў бы ўзняць яшчэ адно праблемнае пытанне. У праграме КПСС запланавана, што працоўныя краіны будуць паступова пераходзіць на 6-гадзінны працоўны дзень. Вельмі хацелася б, каб аднымі з першых перайшлі тыя, хто займаецца на вячэрніх факультэтах. Магчыма, знойдзецца нейкае рашэнне гэтага пытання: або пры 6-гадзінным дні выконваць вытворчыя нормы 7-гадзіннага, або больш зацікавіць прадпрыемствы ў росце сваіх кадраў тэхнікаў да інжынераў і ўстанаўленні ім 6-гадзіннага дня з абавязковай работай на сваім прадпрыемстве пасля заканчэння вну ўжо ў якасці высокакваліфікаванага спецыяліста, або нават дазволіць працаваць шэсць гадзін з атрыманнем адпаведна меншай аплаты. Можа знайсціся і іншае выйсце з гэтага становішча. Але пакуль што вячэрнікам вельмі цяжка.

**А. НЕСЦЯРОВІЧ,**
**вячэрнік філалагічнага факультэта.**

## Наладзіць забеспячэнне літаратурай

*Сярод іншых цяжкасцей у вячэрнікаў ёсць і такія, якіх можна было б лёгка пазбегнуць. Я маю на ўвазе забеспячэнне літаратурай. Атрымаць падручнікі — для нас праблема, а рыхтавацца да экзаменаў, семінараў і нават да штодзённых заняткаў у чытальнай зале ў нас застаецца вельмі мала часу. А гэты каштоўны час прыходзіцца яшчэ губляць у чарзе за атрыманнем неабходных падручнікаў. У вольныя ж для нас выхадныя дні на працягу семестра ні бібліятэка, ні чытальныя залы не працуюць.*

*Ці не час для вячэрнікаў зрабіць спецыялізаваныя кніжныя фонды, як гэта зроблена для студэнтаў стацыянара і завочнага аддзялення?*

*М. ТУРКО,*
*студэнтка-вячэрніца.*

# ЧАКАЕМ ВАС НА ЧЭРВЕНЬШЧЫНЕ

Штогод дзесяткі выпускнікоў універсітэта едуць працаваць у Чэрвеньскі раён. Яны і добра працуюць як педагогі, і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці.

Высока трымае марку навучэнца БДУ імя У. І. Леніна выпускнік філалагічнага факультэта 1962 года Міхаіл Мяцельскі. Ён у Клінокскай сярэдняй школе выкладае рускую мову і літаратуру, нямецкую мову, вядзе заняткі ў вячэрняй школе сельскай моладзі. Адначасова ён дапамагае праўленню калгаса імя Леніна ў выхаванні сельскай моладзі. Міхаіл Мяцельскі з'яўляецца членам лектарскай групы, выпускае сатырычную сценгазету.

Ала Мурашка ў 1962 годзе скончыла хімічны факультэт. Цяпер яна — настаўніца Раваніцкай сярэдняй школы. Са сваімі абавязкамі Ала спраўляецца паспяхова. Яна праявіла сябе таксама як добрая актывістка. Ала з'яўляецца прапагандыстам камсамольскага палітгуртка «Два светы — два юнацтвы», у якім займаюцца камсамольцы і моладзь саўгаса «Раванічы».

Выпускніца гістарычнага факультэта Святлана Сіманькова з'яўляецца зараз загадчыцай аддзела школ Чэрвеньскага камітэта ЛКСМБ і зарэкамендавала сябе як здольны арганізатар моладзі, выхавацель піянераў і школьнікаў.

Добрая слава ідзе ў нашым раёне аб выпускніцы матэматычнага факультэта Тане Барысевіч, якая працуе ў вёсцы Раванічы. Свой прадмет яна добра ведае і умела выкладае яго. Барысевіч з'яўляецца рэдактарам насценнай газеты, сакратаром педагагічнага савета школы, кіраўніком гуртка «Умелыя рукі».

Выпускніца філалагічнага факультэта Света Будай, якая актыўна ўдзельнічала ў танцавальнай самадзейнасці БДУ, працуе выхавацельніцай у Смілавіцкай школе-інтэрнаце. Яна кіруе танцавальным калектывам пры клубе гарадскога пасёлка Смілавічы.

Добрымі прапагандыстамі палітгурткоў у сетцы камсамольскай асветы сталі выпускнікі філфака Мікалай Вяргейчык, Валянціна Журчаненка, агітатарамі — Раіса Мануйленка, Рафаіл Шысцераў.

Пры Чэрвеньскім камітэце камсамола створаны маладзёжны клуб «Блакітны агеньчык», які арганізуе цікавыя вечары, дыспуты і іншыя мерапрыемствы. Актыўна ўдзельнічаюць у яго рабоце многія выхаванцы універсітэта. Багатыя традыцыі мінулага і гераічныя падзеі сённяшняга дня мы шырока выкарыстоўваем у выхаванні моладзі.

У раёне 70 сярэдніх і васьмігадовых школ і амаль столькі ж пачатковых. Мы запрашаем выпускнікоў універсітэта: прыязджайце пасля заканчэння вучобы ў наш раён. Тут вы знойдзеце работу па душы і самы цёплы прыём з боку чэрвеньскай камсамоліі. Чакаем вас, сябры!

**Віктар КАВАЛЬКОЎ,**
**сакратар Чэрвеньскага сельскага камітэта ЛКСМБ, выпускнік аддзялення журналістыкі 1962 года.**

# „Фізіялагічная траўма“ на хімфаку

**ФЕЛЬЕТОН**

Размова пойдзе пра Івана Ласкова, студэнта 5 курса хімічнага факультэта. Як быццам, ён нічога такога не зрабіў. Нікога не збіў да смерці, бо Іван хлопец «хілы», як гавораць яго аднакурснікі. Ні з каго ён не насмяяўся, бо ведае, што смех — вельмі моцная зброя. Але ж...

Вакол гэтага «але» і паставім вушы сякерай. Вось купіў Іван касцюм. Чорны, як не ведаю што, з іголачкі, са стрэламі на штанах. І, як мае быць, прыйшоў на факультэцкі вечар са сваёй «дамай сэрца». Ільецца музыка, віхрацца лёгкія, як матылькі, пары. Акунуўся ў гэты «вір» і Іван. А на перапынку пайшло ўжо аб ім шушуканне: «Ці Іван гэта? Ай-ай-ай! Так перамяніўся. Нават з дзяўчынай прыйшоў». «Не, гэта не Іван,— казалі другія. — Быць не можа».

Аднак гэта той самы Ласкоў, які ўчора быў у латаных штанах, у замурзанай сарочцы і нячышчаных туфлях. Аб ім ужо і склалася такая думка, што ён не ўмее сачыць за сабой. Неахайны ён. Нагул, гэта сапраўды так. Пакуль сябры не «націснулі» на яго купіць касцюм, ён і хадзіў заўсёды абы як. Знайшліся грошы нават і на паліто. І цяпер Івана не пазнаць.

«А прыкрываўся беднасцю», — казаў хто-ніхто. Ну, гэта тыя, хто не ведаў, што ў Івана няма ні бацькі, ні маці. І хоць ён малады — яму ўсяго 22 гады — хлопец вельмі развіты. Піша вершы. Яго імя вядома кожнаму, хто цікавіцца паэзіяй. За гэта атрымоўвае ганаровую плату — ганарар. І вось, мабыць, у гэты час, калі я пішу пра яго фельетон, Іван піша свой яшчэ не скончаны навукова-папулярны раман.

Хлопец, як бачна, здольны. А адсюль вядзецца і рубель у кішэні. Мабыць, і шушукалі таму на вечары яго таварышы, калі ўбачылі Івана ў такім выглядзе.

Але — адно шушукаць, а зусім іншае — крыўдзіць чалавека. Сябры смяяліся з яго «фізіялагічнай траўмы», як ахарактэрызаваў былы факультэцкі камсорг Ігар Дзярбінскі. Ну, няхай Іван малы ростам, няхай, як некаторыя лічылі, не глядзіцца, калі ён побач з дзяўчынай. Але навошта закранаць чалавека за жывое?

З таго ўсё і пачалося. З гаркаты, мабыць, Іван часта куляў чаркі. Былі выпадкі, калі ён жлукціў хмель, як ваду. Безумоўна, тады трапляў у міліцыю. Так здарылася і 2 лістапада, калі яго падабралі работнікі міліцыі на Друкарскай вуліцы і даставілі ў выцвярэзнік. Але што гэта? На другі дзень Іван апрытомнеў, зноў напіўся і пабег у аддзел міліцыі даказваць сваю невінаватасць. І так «даказваў», што яго зноў былі вымушаны накіраваць у выцвярэзнік.

А вось яшчэ адна запіска з міліцыі. «Паведамляем, што 18 снежня 1963 г. грамадзянін Ласкоў Іван Антонавіч, студэнт 5 курса хімічнага факультэта БДУ... у 23 гадзіны 20 хвілін, знаходзячыся ў п'яным выглядзе, на трамваі заехаў у парк, а калі вадзіцель хацела высадзіць яго, апошні аблаяў яе. Пры дастаўленні яго ў аддзел міліцыі Ласкоў таксама паводзіў сябе недастойна».

За гэта Ласкоў «выкруціўся» грашыма — заплаціў дваццаць рублёў штрафу.

Гэтыя дзеянні студэнта сталі вядомы дэканату факультэта. Мы сядзім з дэканам Іванам Рыгоравічам Цішчанкам і гутарым пра Ласкова. Іван Рыгоравіч мае вялікі педагагічны вопыт. Ён некалькі разоў ужо размаўляў з Ласковым аб яго паводзінах. Не дапамагала. Ласкоў даваў абяцанні не паўтараць дрэнных учынкаў, але гэта былі пустыя словы.

Аднойчы, калі Ласкоў пакінуў сцэны універсітэта і падаўся ў літаратурны інстытут, рэктарат выключыў яго з універсітэта. У інстытут ён не паступіў і вярнуўся ў Мінск, вымаліў, каб яго прынялі зноў у БДУ. І, як раней, вучыўся добра і... працягваў парушаць паводзіны.

Аднойчы Іван, п'яны ўжо, трапіў у кафэ, там яшчэ дадаў. Але пільнае вока дружыннікаў прыкмеціла яго, і вытурылі Івана з кафэ. І зноў дарога ў выцвярэзнік.

Мне давялося пагутарыць з яго таварышам — Мялешкам (разам яны выпускалі насценную газету факультэта). Вось што Мялешка сказаў: «Любіць наш Ваня быць у цэнтры ўвагі. На сходах заўсёды бярэ слова. Гаворыць абы што, даказваючы сваё. Ганарлівы. Любіць кінуць жарт у чужы бок». Некалі за «бурнае» выступленне на сходзе яму прыйшлося нават даць суровую вымову па камсамольскай лініі.

Многія са студэнтаў хімфака, з якімі я гутарыў пра Ласкова, зыходзіліся на адным: хлопец ён добры, але бываюць зрывы, звязаныя з «фізіялагічнай траўмай»...

Гавораць, на каго бог, на таго і людзі. Людзі — яго аднакурснікі, студэнты хімфака. Насміхаючыся з яго, яны забываюць, што даводзяць чалавека да крайнасці. Чалавеку патрэбна дапамога. А руку ніхто яму не працягвае. Яму горка ад насмешак аднакурснікаў.

Вось так і жыве хлопец з «фізіялагічнай траўмай», як любяць казаць на хімфаку. Аднак гэта не тая траўма, аб якой ужо склалася думка, а траўма душы, траўма яго маралі. І, каб зусім чалавека не вывесці са строю, патрэбна хлопцу трэцяе плячо, плячо сябра. Патрэбна магутная сіла грамадскага ўздзеяння.

**К. КАНУС.**

## ГУМАР

* * *

Маці трохгадоваму сыну:

— Пеця, ты што соўваеш усюды свой нос?

— Не, мама, толькі ў варэнне.

* * *

— Тата, наша мама добрая?

— Канешне, сынок. Яна ж так цябе шкадуе.

Малыш уздыхнуў:

— Марожанага таксама...

# Прыязджайце ў край вялікай хіміі



*Дырэктарам Жабінскай васьмігадовай школы Любаньскага раёна працуе Леанід Іванавіч Шырын. Ён паспяхова скончыў некалькі гадоў таму назад завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта. У калектыве настаўнікаў сваёй школы Леанід Іванавіч карыстаецца заслужаным аўтарытэтам, вядзе вялікую педагагічную і грамадскую работу.*

*Любаньшчына — край вялікай хіміі. Тут працуе і працягвае будавацца Салігорскі калійны камбінат. У гутарцы з нашым карэспандэнтам Леанід Іванавіч прасіў перадаць прывітанне студэнтам універсітэта і пажаданні вялікіх поспехаў у вучобе. Ён запрашае выпускнікоў універсітэта на Любаньшчыну. Тут многія знойдуць сабе па душы вялікую і неабходную для Радзімы работу па выхаванню і навучанню маладога пакалення.*

*На здымку: Леанід Іванавіч Шырын.*

# Наша рэпліка Г. Круглову

**Некалькі дзён таму назад мы са здзіўленнем слухалі па радыё выступленне студэнта вячэрняга аддзялення журналістыкі Германа Круглова аб рабоце нашага Клуба інтэрнацыянальнай дружбы. Па-першае, сам Круглоў выступаў перад слухачамі як «член праўлення Клуба інтэрнацыянальнай дружбы БДУ», хоць амаль два гады ўжо не з'яўляецца ім. Па-другое, а гэта мы лічым больш важным, ён аперыраваў фактамі паўтара-двухгадовай даўнасці, г. зн. тымі, якія былі вядомы яму тады, калі ён уваходзіў у склад КІДа. Ён прыводзіў імёны актыўных удзельнікаў КІДа (таксама тых, хто быў у ім два гады назад), а цяперашніх членаў Клуба, якія вядуць асноўную работу ва універсітэцкім маштабе, ніводнага не назваў. Ён расказваў аб мерапрыемствах, якія лічыў цікавымі (таксама два гады таму назад), хоць у апошні час КІД правёў шмат вечароў, сустрэч і іншых мерапрыемстваў, куды больш цікавых.**

**Вось мы і раім Г. Круглову з большай адказнасцю падыходзіць да выканання свайго журналісцкага абавязку. Такія ж метады работы, якімі ён карыстаецца цяпер, зусім не дастойныя для будучага работніка прэсы.**

**Члены Клуба інтэрнацыянальнай дружбы.**

# Поспех гімнастак

Адбылося першынство вну Мінска па спартыўнай гімнастыцы. Наша жаночая каманда заваявала першае месца, а мужчынская засталася на чацвёртым.

Майстар спорту Ларыса Кулік (3 курс фізфака) стала чэмпіёнкай горада. У спаборніцтвах па праграме кандыдатаў у майстры першакурсніца фізфака Рая Чэхава заняла 2 месца. Сярод першаразрадніц першынствавала другакурсніца біяфака Ала Кузняцова.

**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02032. Тыр. 2000. Зак. 307.